# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

«Не можа не радаваць і той факт, што сёлета ў нашы школы пойдзе больш за 106 тысяч першакласнікаў — на 1,6 тысячы дзетак больш, чым у мінулым годзе. Такое папаўненне невыпадковае. Гэта вынік пастаяннага клопату нашай дзяржавы і грамадства пра сям'ю, дзяцей, іх здароўе, навучанне і выхаванне», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Першакласнікаў ён павіншаваў асобна, паколькі для іх «гэты дзень — адна з самых памятных падзей, пачатак вялікага шляху да ведаў і першы этап сталення». Ён заклікаў педагогаў зрабіць усё неабходнае, каб дзеці былі ахінуты клопатам і ўвагай.

У краіне пастараліся зрабіць, каб 1 верасня стала сапраўдным святам для ўсіх школьнікаў, педагогаў і бацькоў. Дзяржава накіравала на гэта велізарныя бюджэтныя сродкі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «І мы лічым іх важнымі інвестыцыямі, фінансавымі ўкладаннямі ў будучыню краіны, у новае пакаленне грамадзян, у тых, хто будзе як зрэнку вока берагчы і захоўваць нашу Айчыну, нашу краіну, нашу Беларусь. Наша галоўнае дасягненне і здабытак — чалавечы капітал. І на гэта грошай шкадаваць ні ў якім разе нельга», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Не абмінуў увагай Прэзідэнт і праблемы беларускай адукацыі, рашэннем якіх займаецца цяпер дзяржава. Гаворка, у прыватнасці, зайшла пра залішнюю загружанасць школьнікаў хатнімі заданнямі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння ўрад займаецца аптымізацыяй працэсу навучання. На думку кіраўніка дзяржавы, неабходна зрабіць так, каб асноўныя веды дзеці атрымлівалі ў школе. «Не павінен вучань, адвучыўшыся 6-7 гадзін у школе, прыходзіць дадому і яшчэ 5-6 гадзін рыхтаваць хатнія заданне. Паглядзіце, у каго мы ператвараем нашых дзяцей», — абурыўся Прэзідэнт. Дома вучань малодшых класаў павінен працаваць паўтары — максімум дзве гадзіны, старшакласнікі — тры — тры з паловай гадзіны, дзякуючы гэтаму дзеці стануць нашмат здаравейшымі, упэўнены Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў незадаволенасць тым, як працуюць школы ў суботу. Гэты дзень не павінен быць выхадным, школьнікі павінны прысвячаць яго фізкультуры, урокам працы. «Субота — ніяк не выхадны дзень, асабліва для калектыву школы», — адзначыў Прэзідэнт. Ён прапанаваў прыбраць лішнія гадзіны працы і фізкультуры з сеткі навучальных заняткаў і перанесці іх на суботу.

Па словах кіраўніка дзяржавы, трэба будзе яшчэ шмат чаго зрабіць у плане ўдасканалення працэсу навучання не толькі ў школе, але і ў ВНУ. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка крытычна адазваўся аб якасці цяперашніх падручнікаў. Да канца наступнага года яны будуць прыстасаваны да сучасных патрабаванняў, без усялякіх празмернасцяў. Неабходна зрабіць рашучы крок для ўдасканалення айчыннай сістэмы адукацыі, «у нас для гэтага ёсць усё: воля, жаданне, і самае галоўнае — ёсць спецыялісты, якія могуць вырашыць гэтую задачу».

Школа №56 павінна стаць своеасаблівым маяком і прыкладам у плане ўдасканалення працы з навучэнцамі. Неабходная матэрыяльна-тэхнічная база тут створана. Азнаёміўшыся з ёй, Прэзідэнт застаўся задаволены ўмовамі для навучання і выхавання. Кіраўнік дзяржавы наведаў клас, дзе будуць вучыцца першакласнікі, кабінет для навучання ігры на музычных інструментах. Прэзідэнт пабываў у спартыўных залах, басейне і сталовай, дзе пацікавіўся асартыментам страў і іх якасцю. Кіраўнік дзяржавы пакінуў таксама запіс у кнізе ганаровых гасцей, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Выходзячы са школы, Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з бацькамі і педагогамі. Ён сказаў, што ў школе ўсё арганізавана належным чынам для вучобы і развіцця дзяцей. Дзяржава будзе старацца і надалей рабіць усё неабходнае для таго, каб школьнікі атрымлівалі добрую адукацыю, запэўніў Прэзідэнт.

## Класныя навіны

## ЗАРОБАК — У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ЯКАСЦІ ПРАЦЫ

**Эксперымент па апрабацыі ў асобных установах агульнай сярэдняй адукацыі галіновай сістэмы аплаты працы падаўжаецца да 1 студзеня 2016 года. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове ўрада.**

Галіновая аплата працы педагагічных работнікаў прадугледжвае, акрамя выплаты педагогам акладу, таксама і дадатковыя выплаты, якія адлюстроўваюць спецыфіку іх работы, даплаты за ўзровень кваліфікацыі педагагічнага работніка і галіновыя выплаты за выкананне асобных відаў работ. Маюцца на ўвазе арганізацыя харчавання, аздараўленне навучэнцаў, работа з адоранымі дзецьмі і іншыя. Класным кіраўнікам устанаўліваюцца галіновыя выплаты за тыя віды работ, якія раней ім не аплачваліся. Фактычна памер заробкаў педагогаў ставіцца ў прамую залежнасць ад якасці іх работы.

У ходзе маніторынгу было ўстаноўлена, што сярэдняя заработная плата педагагічных работнікаў, якія задзейнічаны ў эксперыменце, павысілася ў параўнанні з сярэдняй заработнай платай педагагічных работнікаў у галіне. Адбылася істотная дыферэнцыяцыя ў аплаце працы, абумоўленая характарам, аб'ёмам і якасцю выкананых педагогамі функцый.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ОАО «Брестский комбинат строительных материалов»
извещает о подаче в экономический суд заявления
об экономической несостоятельности общества.
УНП 200295903

# У ШКОЛАХ СТАНОВІШЧА «ЦЕСНА»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У школьным двары абсталявана вялікая спартыўная зона, якая ўключае футбольнае поле, баскетбольную пляцоўку і хакейную каробку. На базе школы адкрыецца спецыялізаваны спартыўны футбольны клас.

Новабудоўля ў гродзенскім мікрараёне «Вішнявец» — адна з самых доўгачаканых. Мікрараён з насельніцтвам каля 56 тысяч расце, таму новая школа дазволіць разгрузіць перапоўненыя суседнія ўстановы адукацыі. Тым больш што ў мікрараёне здарыўся сапраўдны «бэбі-бум». У выніку новая 40-я школа паставіла рэкорд — тут сфарміравана 16 першых класаў па 25-26 вучняў у кожным.

Паводле задумкі, школа павінна стаць адукацыйным, культурным і спартыўным цэнтрам, даступным у пазаўрочны час для ўсіх жыхароў мікрараёна. Яе спартыўна-аздараўленчы комплекс уключае два басейны, дзве трэнажорныя залы, чатыры валейбольныя, дзве баскетбольныя пляцоўкі, тэнісны корт і хакейную каробку. Пры гэтым для старонніх наведвальнікаў прадугледжаны асобны ўваход, што выключае іх трапленне на школьную тэрыторыю. Дзякуючы такой магутнай спартыўнай базе новая школа стане месцам для размяшчэння дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ па цяжкай і лёгкай атлетыцы, барацьбе і веласпорце. Вучні школы змогуць наведваць разнастайныя спартыўныя секцыі.

А ў Пінску святкуе наваселле «вясёлкавая» школа. Так яе назвалі мясцовыя жыхары не толькі таму, што яна пабудавана ў мікрараёне з аднайменнай назвай, але і з-за таго, што чатырохпавярховы будынак пафарбаваны ў разнастайныя колеры вясёлкі.

Школа атрымалася сучаснай, утульнай і шматфункцыянальнай. У цэнтральным корпусе знаходзяцца спартыўная, трэнажорная і гімнастычная зала, у якіх хоць заўтра можна праводзіць спаборніцтвы па гандболе, міні-футболе, баскетболе, валейболе.

Да таго ж у новай школе створана безбар'ернае асяроддзе. Унутры і звонку будынак абсталяваны пандусамі, маецца і спецыяльны ліфт, пад дзяцей з асаблівымі патрэбамі абсталяваны санвузлы і гардэробы. Школа разлічана на 1020 месцаў, але заяў ад вучняў і іх бацькоў пададзена значна больш. У першы клас прынята 313 дзяцей, якія размеркаваны на 12 класаў.



Сярэднюю школу г. Мінска №32 наведалі Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр КОСІНЕЦ і намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Ігар КАРПЕНКА.

Не меншую радасць, чым пінчане, адчуваюць сёння вучні, іх бацькі і педагогі Высокаўскай сярэдняй школы Камянецкага раёна. Школа адкрываецца пасля рэканструкцыі і капітальнага рамонту. Больш за 700 вучняў школы займаліся падчас рамонту ў іншых прыстасаваных памяшканнях, што стварала нязручнасці для ўсіх. Сёння школа зззяе прыгажосцю і чысцінёй, радуе новымі абсталяваннем і мэбляй. Рэканструкцыя праведзена за сродкі, якія выдзелены па праграме развіцця горада Высокае.

## ЭЛЕКТРОННЫЯ РЭСУРСЫ — У ДАПАМОГУ

Значныя фінансавыя сродкі былі выдзелены сёлета і на ўмацаванне рэсурснай базы вучэбных кабінетаў беларускіх школ. У 2013-2014 гадах ва ўстановы адукацыі было пастаўлена абсталяванне для 442 кабінетаў фізікі. Сёлета плануецца аснасціць сучасным абсталяваннем яшчэ 140 кабінетаў фізікі і 35 кабінетаў хіміі.

Сур'ёзнай падмогай для педагогаў і вучняў павінны стаць каля 200 электронных вучэбных курсаў, створаных у Нацыянальным інстытуце адукацыі па ўсіх вучэбных прадметах — з 1 па 11 клас. Да пачатку новага навучальнага года школьнікі забяспечаны падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ў поўным аб'ёме. Сёлета ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі будзе выкарыстоўвацца 499 найменняў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, з іх 249 — у школах з беларускай мовай навучання і 250 — з рускай. Ёсць сярод вучэбных выданняў і навінкі. Гэта дапаможнікі па кітайскай мове для 10 класа, па нямецкай і французскай мове — для 7 класа гімназій, па англійскай — для 11 класа гімназій. Выдадзена таксама 14 найменняў вучэбных дапаможнікаў, выкананых на аснове рэльефна-кропкавай сістэмы Брайля для дзяцей з парушэннямі зроку.

## ПРАФЕСІЙНАЯ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ

Што тычыцца зместу адукацыі, то з новага навучальнага года пачынаецца пераход на адносную завершанасць II ступені агульнай сярэдняй адукацыі і ўводзіцца профільнае навучанне ў старшай школе. Змены ў найбольшай ступені закрануць пятыя і дзясятыя класы школ. Міністэрства адукацыі зацвердзіла тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі, былі скарэктаваныя вучэбныя праграмы для навучэнцаў першых, пятых і дзясятых класаў. Дарэчы, для дзесяцікласнікаў вучэбныя праграмы распрацоўваліся з улікам двух узроўняў вывучэння прадметаў — базавага і павышанага. У мінскіх школах кожны другі дзясяты клас будзе мець профільную скіраванасць. Плюс у сталіцы адкрываецца пяць педагагічных класаў. А ўсяго па краіне будзе створана 200 класаў педагагічнага профілю.

Для вучняў педагагічных класаў распрацавана праграма факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў педагагічную прафесію». На працягу двух гадоў школьнікі павінны будуць знайсці адказ на шэраг пытанняў. Што такое педагагічная дзейнасць? Якія патрабаванні прад'яўляюцца да настаўніка? Што павінен умець настаўнік? Якімі якасцямі ён павінен валодаць? І ці магу я быць настаўнікам?

Першыя ўрокі ва ўсіх установах адукацыі пройдуць на тэму «На цябе, наша моладзь, надзея!» Традыцыйна на першы ўрок у школы ў гэты дзень завітаюць прадстаўнікі ўрада, Адміністрацыі Прэзідэнта, мясцовых улад, прафсаюзныя актывісты і дзеячы культуры і мастацтва, славутыя спартсмены і ветэраны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*




Адкрыццё новай школы — трайное свята для шматдзетнай сям'і Місілевічаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

## Падрабязнасці

# ПАСТУПАЦЬ НА ЗАВОЧНАЕ ЗМОГУЦЬ І МАЛАДЫЯ МАЦІ

**Члены Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах лічаць неабходным перагледзець умовы паступлення на завочную бюджэтную форму навучання. Пра гэта паведаміла журналістам старшыня камісіі, віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Наталля КАЧАНАВА.**

Зараз паступаць туды могуць толькі абітурыенты, якія ўжо працуюць па роднаснай спецыяльнасці.

— А чаму б не даць магчымасць атрымліваць вышэйшую адукацыю на бюджэце завочна маладым матулям, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, або матулям, якія выхоўваць дзіця-інваліда і з гэтай прычыны не могуць атрымліваць адукацыю на дзённай форме навучання? — заўважыла Наталля Качанава.

Выпускнікам ВНУ і ССНУ таксама плануецца дазволіць паступаць для атрымання другой адукацыі на завочнай форме, не прад'яўляючы працоўных кніжак. Атрымаўшы накіраванне на размеркаванне, у пачатку ўступнай кампаніі выпускнікі ВНУ і ССНУ яшчэ не маюць на руках працоўных кніжак. «Мы прапанавалі Міністэрству адукацыі гэтае пытанне разгледзець і ўнесці дапаўненні або змяненні ў правілы, якія дазволяць такім абітурыентам замест працоўнай кніжкі прад'яўляць накіраванне на працу», — удакладніла старшыня камісіі.

Каментуючы страсці, якія распаліліся вакол электроннага залічэння ў БДЭУ, намеснік прэм'ер-міністра адзначыла, што камісія старанна разбіралася з гэтай сітуацыяй, але ніякіх парушэнняў не выявіла. У выніку прыйшлі да высновы, што ва ўніверсітэце тлумачальная работа з абітурыентамі не была праведзена належным чынам. І, каб пазбегнуць такіх праблем у далейшым, пачынаць тлумачыць нюансы электроннага залічэння трэба ўжо цяпер.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*